Казка за казкай

# ЗАЛАТАЯ РАКАВІНКА

Кітайскія народныя казкі



Казка за казкай

# ЗАЛАТАЯ РАКАВІНКА

## Кітайскія народныя казкі

*Пераклаў на беларускую мову*
*Міхась Пазнякоў*

МІНСК
«ЮНАЦТВА»
1989

ББК84.5 Кит
З-22

Серыя заснавана ў 1982 годзе

*Мастак Н. У. Сустава*

З $\frac{4804020400-057}{М307(03)-89}$ 109—89

ISBN 5-7880-0166-8

© Выдавецтва «Юнацтва», 1989.



## Качаня і пеўнік

Прыйшла вясна. Ярка свеціць сонца, цвітуць кветкі. Пеўнік і качаня выйшлі разам пагуляць каля рэчкі.

Пеўнік адразу адшукаў у траве розных кузурак ды чарвякоў і пачаў радасна дзяўбці іх сваёй вострай дзюбай.

А ў качаняці дзюба пляскатая, і не можа яно ніяк чарвяка ўхапіць. Закракала яно, занепакоілася.



Убачыў гэта пеўнік. Злавіў ён чарвяка і скарміў яго качаняці. Залопала качаня ад радасці крыльцамі.

Падышлі яны да вады. Качаня і кажа: «Братка пеўнік, зараз я налаўлю рыбы і цябе пачастую». А пеўнік адказвае: «І я з табой». «Не, нельга! — гаворыць качаня,— ты ж не ўмееш плаваць, утопішся».

Скокнула качаня ў рэчку. А пеўнік не верыць, што ўтапіцца можа, і крадком услед за качанём — у ваду.

Плавае качаня ды рыбку ловіць. Раптам чуе яно, што пеўнік кліча на дапамогу. Кінулася качаня ратаваць пеўніка. Пасадзіла яго сабе на спіну, так і даплылі да берага.

Выбраліся на бераг. Заўсміхаўся пеўнік, заківаў галоўкай ды кажа: «Дзякуй табе, братка качаня». А качаня адказвае: «Не варта, мы ж заўсёды адзін аднаму дапамагаем!»



## Капуста і насенне

Пайшлі белае зайчаня і шэрае зайчаня да старога казла ў госці. І падарыў ім казёл капусту, якую сам пасадзіў і вырасціў.

Узяло шэрае зайчаня капусту, сказала: «Дзякуй, дзядзечка казёл». І пайшло задаволенае дадому.

А белае зайчаня кажа: «Дзядзечка казёл, лепш дай мне насенне. Я хачу сам вырасціць капусту».



Даў яму стары казёл насенне капусты. Вярнулася белае зайчаня дадому, зямлю ўзрыхліла ды насенне пасеяла.

Працуе белае зайчаня ў агародзе: кожны дзень капусту вадой палівае, зямлю ўгнойвае, пустазелле вырывае ды шкодных кузурак ловіць. І пачала расці ў яго капуста хутка і добра.

А шэрае зайчаня цэлымі днямі палежвае сабе. Прагаладаецца — з'есць капусту, якую даў яму казёл. А калі скончыцца ў яго капуста, то ідзе да казла яшчэ выпрошваць.

Вырасла ў белага зайчаняці капуста. Узяло яно каромысел і панесла два кошыкі капусты казлу.

А тут і шэрае зайчаня зноў прыйшло да казла па капусту.

І сустрэліся белае зайчаня і шэрае зайчаня каля самых варот хаты старога казла. І стала шэраму зайчаняці вельмі сорамна, што яно такое лянівае.



## Малпачка

Аднойчы спусцілася малпачка з гор і трапіла на кукурузнае поле. Расла кукуруза па ўсім полі высокая і густая. Малпачка сарвала вялікі кукурузны пачатак, узваліла яго на плячо і пакрочыла далей. Бачыць яна наперадзе персікавы сад, а ў садзе спеюць вялікія чырвоныя персікі. Кінула малпачка кукурузу, пайшла персікі рваць.



Сарвала яна персік і заспяшалася дадому. Трапілася ёй па дарозе поле, засаджанае кавунамі. Выраслі кавуны вялізныя ды круглыя. Узрадавалася малпачка, кінула персік і сарвала кавун.

Нясе малпачка вялізны кавун, радуецца. Раптам бачыць: скачуць зайчыкі на дарожцы, такія забаўныя.

Кінула малпачка кавун і пагналася за зайчыкамі. А зайчыкі ўзялі ды ўцяклі ў лес. І як ні шукала іх малпачка, не магла знайсці. І давялося ёй ні з чым дадому вяртацца.





## Залатая ракавінка

Даўным-даўно на беразе цудоўнага Паўднёвага мора жыў юны рыбак па імені А Сінь. Жыў ён адзін-адзінюткі. І ў зімовую сцюжу, і ў летнюю спёку, кожны дзень, як толькі пачынала світаць, выходзіў ён у мора лавіць рыбу. І кожны дзень спяваў А Сінь свае дзівосныя песні. Ды так прыгожа, што зачароўваў усіх, хто чуў яго спеў.

Аднойчы закідваў ён сетку мноства разоў, але толькі апоўдні напоўніў свой кошык рыбай. Сабраў ён сетку і пад пякучымі сонечнымі промнямі пайшоў дадому. І раптам бачыць: на гарачым прыбярэжным пяску ляжыць маленькая залатая рыбка. А над ёю, распасцёршы крылы, лятае прагная варона, каб праз момант рынуцца ўніз.



Рыбка задыхалася. Яна бяссільна то раскрывала, то закрывала рот. Кінуўся А Сінь да залатой рыбкі і падняў яе.

Быстра пабег юнак да мора, асцярожна апусціў рыбку ў ваду. Прайшло нямала часу, пакуль рыбка слаба варухнула хвастом і пачала дыхаць. Потым яна крыху падняла галаву, сумна паглядзела на А Сіня, які схіліўся над самай вадой, і паплыла ў марскую глыбіню.

Вярнуўся А Сінь дадому, паставіў разагравацца абед, а сам пачаў папраўляць старую сетку. Але ўвесь час ён успамінаў выратаваную ім залатую рыбку, уяўляў сабе, як яна паволі плыве ў мора, і на твары А Сіня з'яўлялася шчаслівая ўсмешка.

На другі дзень А Сінь, як заўсёды, напяваючы песню, пайшоў лавіць рыбу. Закінуў ён сетку ў мора, а калі выцягнуў яе, то ўбачыў, што не злавіў ніводнай рыбкі. У сетцы была толькі адна залатая марская ракавінка. Дастаў юнак ракавінку і кінуў яе назад у мора. І колькі ні закідваў ён сетку ў той дзень, кожны раз выцягваў усяго толькі гэту марскую ракавінку.

Страціў юнак надзею на ўдачу, прысеў стомлены на беразе мора. А ракавінка тая ціхенька падпаўзла да яго. Задумаўся А Сінь



і сам не заўважыў, як узяў у рукі ракавінку. А калі ўзяў, то са здзіўленнем убачыў, якая незвычайна прыгожая была гэта марская ракавінка!

Прынёс А Сінь ракавінку дадому, апусціў яе ў таз з чыстай вадой, а сам выйшаў на двор і сеў папраўляць сваю старую сетку. Надышоў вечар. На дварэ сцямнела. Ведаючы, што на вячэру ў яго і рысінкі няма, ён вырашыў крыху раней легчы спаць, каб забыцца пра голад.

Пайшоў А Сінь у хату і толькі адчыніў дзверы, як адтуль запахла нечым вельмі смачным. Глядзіць ён і бачыць: стол засланы, а на ім багатая вячэра! У першае імгненне вырашыў, што гэта яму сніцца, затым падумаў: можа, нехта заказаў пачастунак для гасцей, а яго не туды прынеслі. Стаў чакаць гаспадара пачастунку.

А Сінь прасядзеў на парозе хаты да глыбокай ночы. Ды, відаць, ніхто не збіраўся прыходзіць па пачастунак, і галодны А Сінь павячэраў на славу.

Назаўтра А Сінь, як звычайна, пайшоў да мора лавіць рыбу. А вечарам, вярнуўшыся дадому, ён зноў убачыў багатую вячэру на сваім стале. На трэці дзень усё паўтарылася зноў.

У гэту ноч А Сінь не заснуў, усё думаў, як



даведацца, адкуль з'яўляецца вячэра. І нарэшце прыдумаў. За́відна ён пайшоў у мора і намнога раней звычайнага вярнуўся дадому. Употай узлез на дрэва, што расло каля самага акна хаты. Адтуль ён мог бачыць усё, што рабілася ў хаце. І ўбачыў А Сінь вельмі прыгожую маладую дзяўчыну, якая прыбірала ў яго хаце.

Калі загарэлася вячэрняя зорка, дзяўчына прыгатавала вячэру, паставіла на стол, а сама пачала лапіць старое адзенне А Сіня.

А Сінь ціхенька злез з дрэва і быстра зайшоў у хату. Дзяўчына хацела схавацца, але юнак перагарадзіў ёй дарогу. Падзякаваў за клопаты і дапамогу і вельмі ветліва пачаў распытваць у яе: як завуць і адкуль яна.

Глянула дзяўчына сваімі яснымі вачыма на А Сіня і, засаромеўшыся, сказала: «Завуць мяне Залатая ракавінка, а дом мой у глыбіні марской. Але я хачу жыць тут, сябраваць з табой, навучыцца спяваць твае песні. Дазволь, калі ласка, мне застацца ў цябе!»

Як узрадаваўся А Сінь: у яго будзе сябар!

Выбег юнак з хаты, нарваў палявых кветак, накасіў духмяных траў. Кветкамі заслаў пасцель, а з пахучых траў сплёў полаг. І калі месяц, глянуўшы праз акно, асвяціў пакой,

дзяўчына ўжо соладка спала на гэтай пасцелі з кветак. З той пары маленькі пакой пастаянна быў напоўнены водарам свежых палявых кветак.

Шчаслівы час заўсёды бяжыць хутка. Прайшло некалькі год. А Сінь узмужнеў і стаў статным прыгожым юнаком. А Залатая ракавінка яшчэ больш папрыгажэла. Але вось аднаго



разу ўночы прачынаецца А Сінь і бачыць: сядзіць дзяўчына, слязамі горкімі заліваецца!

Доўга выпытваў А Сінь, чаму яна плача, і, нарэшце, Залатая ракавінка прызналася: «Я і ёсць тая залатая рыбка, якую ты выратаваў некалькі год назад. Я — дачка Царыцы мора. Употай прыбегла я да людзей. А цяпер у Палацы цара-дракона спахапіліся і шукаюць мяне. Сягоння,— плачучы працягвала дзяўчына,— да захаду сонца я павінна вярнуцца ў Палац, а не то Царыца мора пакарае людзей, наслаўшы вялізную паводку. З сённяшняга дня не быць нам больш ніколі разам».

Узяў А Сінь дзяўчыну за руку, пачаў суцяшаць і дапытвацца, ці нельга як-небудзь гору дапамагчы. «Можна,— адказала дзяўчына,— але трэба дабрацца да Чарадзейнага вострава і папрасіць Царыцу, каб яна дала згоду на наша вяселле. А для гэтага давядзецца табе прайсці праз вельмі цяжкія выпрабаванні».

Гаворыць А Сінь: «Каб не разлучацца з табой, я гатоў на любыя выпрабаванні».

Сеў ён у маленькую лодку і смела паплыў у чорнае непрыветлівае мора.

Узбушавалася мора. Зароў ураган: «Вяртайся,пакуль не позна, пакуль я цябе на кавалкі не разадраў!» Вялізныя хвалі пагрозна

гулі: «Ідзі назад, а не то накрыем мы цябе і кінем на дно марское!» Ды не спалохаўся А Сінь ні лютага ўрагану, ні страшных хваляў. Настойліва плыў ён наперад.

Раптам у непрагляднай цемры марской узнік чырвоны прамень. Асвяціў ён каралавы востраў, а на ім убачыў А Сінь раззлаваную Царыцу мора. Тут два вартавыя-кракадзілы





схапілі юнака, падвялі яго да Царыцы. «Мала таго, што ты дачку маю ўкраў,— сказала Царыца,— дык яшчэ асмеліўся ўварвацца на мой каралавы востраў!»

Гаворыць спакойна А Сінь: «Не краў я Залатую ракавінку. А цяпер прыйшоў прасіць у Царыцы бласлаўлення на вяселле, прасіць не разлучаць нас!» Адказвае Царыца: «Забудзь пра Залатую ракавінку! Вазьмі ўзамен усё, што ні пажадаеш! Даю табе на роздум тры дні».

Невядомыя сілы падхапілі юнака разам з лодкай і вынеслі на паверхню мора. Агледзеўся А Сінь, а ад вострава і следу не засталося. Паплыў юнак дадому. Нарэшце прычаліў да берага і кінуўся да сваёй хаты. Але не пазнаў яе: на месцы былой хаціны — высокі прыгожы дом.

Сустрэла юнака каля парога Залатая ракавінка, павяла яго ў дом. А там усё так і зіхаціць золатам і серабром. Гаворыць сумна дзяўчына: «Ну вось, віншую цябе са шчаслівым вяртаннем і здабытым багаццем. Цяпер будзеш жыць ты без маркоты і клопатаў. А я пасляпаўтра вярнуся ў мора. Толькі прашу цябе, не спявай, калі ласка, сваіх песень, не вымушай мяне пакутаваць і плакаць».



Тры дні ні на крок не адыходзіў А Сінь ад дзяўчыны, а калі наступіла трэцяя ноч, ён зноў паплыў у мора. Не баючыся ні злога ўрагану, ні страшных хваляў, даплыў ён да Чарадзейнага вострава і заявіў Царыцы: «Не патрэбны мне ні залатыя, ні сярэбраныя горы! Патрэбна мне толькі Залатая ракавінка!» Адказвае яму Царыца: «Праз тры дні Залатая ракавінка павінна вярнуцца на Чарадзейны востраў, а ты можаш выбраць сабе тут любую прыгажуню».

Спешна вярнуўся А Сінь дадому. Сустрэла яго Залатая ракавінка. Глядзіць на яе А Сінь і не пазнае: на твары дзяўчыны глыбокія маршчыны, а валасы пасівелі і сталі шорсткімі, як сухая трава. Просіць яна плачучы: «Адпусці мяне. Праз тры дні злы чараўнік зусім ператворыць мяне ў старую». Ды як ні маліла, як ні прасіла дзяўчына, не адпусціў яе А Сінь. Ён яшчэ мацней пакахаў Залатую ракавінку.

Зноў тры дні не адыходзіў ні на крок ад дзяўчыны А Сінь. Вось надышла трэцяя ноч. Зачыніў асцярожна юнак усе вокны і дзверы, а сам зноў на лодцы кінуўся ў марскі вір, насустрач сярдзітым хвалям і лютаму ўрагану. Праз маланкі і гром прабіўся ён да Чарадзейнага вострава.

З пераможнай усмешкай сустрэла яго Ца-



рыца: «Залатая ракавінка ператварылася ўжо ў старую. Пакінеш яе ў сябе — людзі смяяцца будуць. А тут, глядзі, колькі прыгажунь, выбірай, якую хочаш!» Узмахнула Царыца рукой, і адразу, танцуючы лёгкі танец, з'явіліся на востраве прыгажуні феі. Ды ў сэрцы А Сіня жыла толькі адна-адзіная дзяўчына. Закрычаў ён Царыцы: «Не патрэбны мне ні золата, ні каштоўныя камяні; не патрэбны мне прыгажуні ні зямныя, ні марскія. Патрэбна мне адна Залатая ракавінка — маладая ці старая!»

Нахмурылася Царыца, узмахнула рукой, і ў той жа момант прыбеглі вартавыя-кракадзілы, схапілі А Сіня і прыкавалі жалезнымі ланцугамі да падводнага каменя. Шалёныя хвалі з лютасцю накінуліся на юнака. А царыца сказала грозна: «Не згаджаешся адпусціць Залатую ракавінку ў мора, не думай выйсці жывым адсюль!»

Раз'юшаныя хвалі, нібы жалезныя бізуны, хвасталі А Сіня, злы ўраган, нібы тысячы вострых нажоў, рэзаў цела. Але бясстрашны юнак крычаў Царыцы: «Бі мяне, рэж мяне, толькі не памяняю я Залатую ракавінку нават на хрустальны палац!»

Як ні лютавалі хвалі, як ні білі, ні хвасталі яго, не згінаўся А Сінь перад імі. І здалася

Царыца. Зноў узмахнула яна рукой, і ў той жа момант супакоіліся хвалі. А вартавыя вызвалілі А Сіня з ланцугоў і падвялі да Царыцы.

Падышла Царыца бліжэй да юнака, усміхнулася і сказала: «Віншую цябе, ты перамог! Сваёй мужнасцю і вернасцю Залатой ракавінцы заваяваў ты яе любоў».

Падала Царыца яму жамчужыну, падару-



нак да вяселля. І ў адзін момант лёгкі, халаднаваты вецярок вынес А Сіня на паверхню мора.

Прыбег юнак дадому. Як толькі асвяціла жамчужына дзяўчыну, што ляжала хворая, адразу стала яна такой прыгожай, якой і была. Паднялася яна, радасна ўсміхаючыся, пайшла насустрач А Сіню, і святло шчасця, якое выпраменьвалі яе вочы, было ярчэйшым за святло жамчужыны ў руках юнака!

Неўзабаве згулялі яны простае, але слаўнае вяселле. З далёкіх краёў у гэты сціплы куток прыйшлі на вяселле рыбакі.

Яшчэ доўга ўспаміналі людзі прыгажосць маладых, іх шчасце.

А Сінь і Залатая ракавінка пражылі шчасліва восемдзесят гадоў, а потым пакінулі зямлю. Але да гэтага часу, калі на досвітку рыбакі закідваюць сеткі ў гэтых мясцінах Паўднёвага мора, часта чуюць яны, як льецца над морам звонкая чыстая песня А Сіня.

## Змест


КАЧАНЯ І ПЕЎНІК —3

КАПУСТА І НАСЕННЕ — 6

МАЛПАЧКА — 9

ЗАЛАТАЯ РАКАВІНКА — 13

Издание для детей и юношества

**ЗОЛОТАЯ РАКУШКА**
**Китайские народные сказки**

Перевёл **Поздняков** Михаил Павлович

Для детей дошкольного возраста

Минск, издательство «Юнацтва»

На белорусском языке

Выданне для дзяцей і юнацтва

**ЗАЛАТАЯ РАКАВІНКА**

**Кітайскія народныя казкі**

Пераклаў **Пазнякоў** Міхась Паўлавіч

Рэдактар А. М. Каляда

Малодшы рэдактар Н. А. Грышкова

Мастак Н. У. Сустава

Мастацкі рэдактар А. У. Ружо

Тэхнічны рэдактар З. Г. Сень

Карэктар Л. І. Саўчанка

ІБ № 1182

Здадзена ў набор 07.07.88. Падпісана да друку 23.02.89. Фармат 70×84[1]/16. Папера афс. № 2. Гарнітура Кудрашэўская Энцыклапедычная. Афсетны друк. Ум. друк. арк. 2,18. Ум. фарб.-адб. 9,26. Ул.-выд. арк. 1,69. Тыраж 150 000 экз. Зак. 1618. Цана 15 к.

Выдавецтва «Юнацтва» Дзяржаўнага камітэта БССР па справах выдавецтваў, паліграфіі і кніжнага гандлю. 220600, Мінск, праспект Машэрава, 11.

Мінскі ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга паліграфкамбінат МВПА імя Я. Коласа. 220005, Мінск, Чырвоная, 23.

15 к.